***З 9 сакавіка ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі працуе выстава адной кнігі, прымеркаваная да Дня праваслаўнай кнігі і 400-годдзя Куцеінскага Богаяўленскага манастыра.***




У 1623 годзе панам Багданам Статкевічам быў дадзены фундуш на будаўніцтва праваслаўнага манастыра пад Оршай, які ўяўляў сабой таксама кніжны асяродак. Куцеінская друкарня дзейнічала пры манастыры ў 1630 – 1654 гадах.

На выставе прадстаўлены экземпляр друкаванага кніжнага помніка, адно з найпрыгажэйшых богаслужбовых выданняў Куцеінскай друкарні – «Трыфалагіён, альбо Цветаслоў». Гэтае выданне пабачыла свет у 1647 годзе ў друкарні Куцеінскага Богаяўленскага манастыра, дзе выдавалася богаслужэбная, царкоўна-палемічная і асветніцкая літаратура на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах. Выданні вылучаліся своеасаблівым графічным афармленнем.

«Трыфалагіён» інакш называецца «Кветкавая Мінея», «Анфалагіён». Літаральна ў перакладзе з грэчаскай мовы – «збор кветак». У праваслаўнай царкве гэты адменнік частка царкоўнаслужэбнай «Мінеі святочнай», якая змяшчае чынапаследаванні да найболей важных свят, выбраных з «Мінеі месячнай». Выданне змяшчае 19 гравюр-дрэварытаў, у якіх яскрава прасочваюцца рэалістычнасць і самабытнасць. Майстры выкарысталі прыём размяшчэння ілюстрацый у тэксце. Музей кнігі прапануе пазнаёміцца з экзэмплярам, у якім гравюры размаляваны ад рукі.

Выстава будзе працаваць да 31 сакавіка.